# Габелены з жоўтай субмарыны

**У галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася выстава габеленаў Марыі Барысенка "BEATLES forever".**

Марыя Барысенка — выпускніца кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, стыпендыят спецыяльнага фонду прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможца рэспубліканскай выставы-конкурсу "Час не стаіць і не чакае..." ў намінацыі "Тканіны. Габелен. Мадэліраванне". Гэта не першы яе зварот да музычнай тэматыкі. Летась у галерэі "Універсітэт культуры" з поспехам прайшла яе выстава габеленаў "Джаз", а сёлетнія



М.Барысенка. Yellow submarine. Віскоза, акрыл, люрэкс, метал.

"Бітлы" як бы сталі лагічным працягам, бо, па словах самой мастачкі, "спачатку джаз перайначыў свет, а потым "Бітлз". Прадстаўленая серыя габеленаў — спроба знайсці сучаснае пластычнае выражэнне музыкі, якая вось ужо больш за паўстагоддзя застаецца актуальнай, знаходзіць усё новых і новых сваіх прыхільнікаў. Непаўторны аўтарскі стыль М.Барысенка — гэта і сама незвычайная форма яе габеленаў, і іх падсвятленне, і выкарыстанне нетрадыцыйных для гэтага віду мастацтва матэрыялаў (люстэркаў і металу).

**Матэрыялы падрыхтаваў Мікола ЧЭМЕР.**

*gilevitch@nastgaz.by*

**Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў